# СЛОВАЎТВАРАЛЬНАЯ КАТЭГОРЫЯ ’НАЗВЫ АСОБЫ ПАВОДЛЕ АДЗІНКАВАСЦІ’

*Н.К. Архіпава*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

У беларускім мовазнаўстве паслядоўнае вывучэнне словаўтваральных асаблівасцей асабовых назваў пачалося з сярэдзіны дваццатага стагоддзя. Калі ў 50–60-я гады гэта былі фрагментарныя палажэнні ў артыкулах, манаграфіях, дысертацыях, то, пачынаючы з 70-х гадоў мінулага стагоддзя, сталі з’яўляцца працы, поўнасцю прысвечаныя аналізу назоўнікаў са значэннем персанальнасці. У распрацоўку праблем утварэння асабовых назваў унеслі ўклад наступныя навукоўцы: Г. А. Арцямёнак, В. А. Бекіш, В. Л. Варановіч, П. В. Вярхоў, М. Р. Гарбачык, У. М. Генкін, Б. І. Касоўскі, С. С. Кацэвіч, С. С. Клундук, М. М.Кругалевіч, А. А. Лукашанец, В. А. Ляшчынская, А. А. Мачалава, М. А. Паўленка, У. Т. Піскун, В. І. Сянкевіч, П. У. Сцяцко, В. Б. Хацкевіч і інш.

Актуальнасць даследавання абумоўлена тым, што асноўныя пытанні, звязаныя з утварэннем назоўнікаў са значэннем асобы, разгледжаны з дастатковай ступенню паўнаты і канкрэтнасці. Як правіла, рамкі даследаванняў абмежаваны пэўнымі тыпамі, спосабамі, катэгорыямі.

Мэта даследавання – апісаць словаўтварэнне адназоўнікавых асабовых намінацый са значэннем ’назвы асобы паводле значэння адзінкавасці’.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання паслужылі матываваныя назоўнікі адсубстантыўнага ўтварэння, атрыманыя шляхам суцэльнай выбаркі з Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы [1] і Беларуска-рускага слоўніка [2].

Метады даследавання абумоўлены аб'ектам вывучэння і падпарадкаваны яго асноўнай мэце. Менавіта гэта паслужыла асновай пры выбары ў якасці галоўнага апісальнага метаду, які базіруецца на адзінстве прыёмаў абагульнення, сістэматызацыі і інтэрпрэтацыі. Аналіз фактычнага матэрыялу ў працы вядзецца з пазіцый фармальных словаўтваральных сродкаў – фармантаў, аднак значнае месца адводзіцца і семантычнаму аспекту даследавання, паколькі словаўтваральная семантыка – асноўны крытэрый выдзялення, ў разглядаемым разраду лексікі, словаўтваральных катэгорый. Таму на пачатковым этапе даследавання прымяняецца метад дэфініцый, а таксама метад семантычнага паглыблення. Аб’яднанне матываваных назоўнікаў у словаўтваральныя тыпы і словаўтваральныя катэгорыі ажыццяўляецца з дапамогай супастаўляльнага метаду. У даследаванні выкарыстаны статыстычны метад і прыём словаўтваральнага аналізу.

**Вынікі і абмеркаванне.** Намі выяўлена толькі некалькі асабовых назоўнікаў словаўтваральнай катэгорыі ’адзінкавасці’. Як правіла, асабовыя намінацыі са значэннем ’адзінкавасці’ матывуюцца асновамі назоўнікаў, якія абазначаюць сукупнасць, парнасць асоб. Адсубстантыўны назоўнік мужчынскага полу *блізн-юк* ‘адзін з блізнят мужчынскага полу; тое, што і блізняты’, які ўтвораны суфіксам **-юк** і адсубстантыўны назоўнік жаночага роду *блізн-іц-(а)* ‘адна з блізнят жаночага полу; тое што і блізняты’, што ўтвораны з дапамогай суфікса **-іц-(а)** абазначаюць адно з сукупнасці дзяцей, названай базавым словам. Назоўнік мужчынскага роду ***блізнюк*** і жаночая намінацыя ***блізніца*** матывуюцца нематыванымі асновамі адушаўлёных назоўнікаў ніякага роду - ***блізн-(я)*** **(*блізн-(ё)*).**

Найменні *чалядзін, чалядзінец* ‘дваровы чалавек, слуга ў панскім доме’, *чаляднік* ‘работнік у цэхавага майстра ў феадальных гарадах Беларусі, Літвы, Польшчы’, *шляхтун, шляхцюк, шляхціц* ‘польскі дробнапамесны дваранін’ і *шпанюк* ‘блазан, блазнюк; малакасос’ суадносяцца з нематываванымі асновамі зборных назоўнікаў жаночага роду *чэлядзь-(ø), шляхт-(а), шпан-(а)* і ўтвараюцца з дапамогай суфіксаў **-ін, -інец, -ун, -юк, -іц.**

Жаночая намінацыя *шляхц**янк**а* матывуецца, як і мужчынская – асновай зборнага назоўніка жаночага роду *шляхт-(а)*, а жаночая намінацыя *чалядзін**к**а* – асновай адсубстантыўнага асабовага назоўніка мужчынскага роду *чалядзін-(ø)*.



Репозиторий ВГУ

У лінгвістычных працах сустракаюцца розныя меркаванні па пытанні вытворнасці назоўнікаў са значэннем асобы жаночага полу. Напрыклад, П.У. Сцяцко лічыць, што назвы асоб жаночага полу маюць два шляхі ўтварэння: першы – ад асноў асабовых назоўнікаў мужчынскага роду (*чэмпіён → чэмпіён-к-(а)*), а другі – мужчынскія і жаночыя намінацыі ад адной словаўтваральнай базы (*школ-(а) → школь-нік* і *школь-ніц-а*) [3]. Мы ў сваім даследаванні падтрымліваем навукоўца і фемінінатывы *шляхцянка* і *блізніца* адносім да паралельнага словаўтварэння назваў асоб жаночага полу, дзе фарманты асобы жаночага полу і асобы мужчынскага полу далучаюцца да адной і той жа матывавальнай асновы (*шляхт-(а) → шляхт-ун, шляхц-юк, шляхц-іц* і *шляхц-янк-(а); блізн-(я)* (*блізн-(ё)*) *→ блізн-юк* і *блізн-іц-(а)* ), а жаночую намінацыю *чалядзінка* – да "паслядоўнага" словаўтварэння назваў асоб жаночага полу (*чэлядзь → чалядз-ін → чалядзін-к-(а)*). Наша матывацыя жаночай намінацыі *шляхцянка* не супадае з традыцыйнай. Аўтары Словаўтваральнага слоўніка беларускай мовы намінацыю *шляхц**янка*** ўтвараюць ад асновы асабовага назоўніка мужчынскага роду *шляхц/іц/-(ø)* [4, 402].

**Заключэнне.** Такім чынам, словаўтваральная катэгорыя 'назвы асобы паводле адзінкавасці' ў сучаснай беларускай мове прадстаўлена невялікай колькасцю назоўнікаў жаночага і мужчынскага роду са значэннем персанальнасці, утварэнне якіх адпавядае пяці граматычным мадэлям (граматычная мадэль – гэта схема ўтварэння слова з улікам часцінамоўнай прыналежнасці і класіфікацыйных граматычных катэгорый матывавальнага і матываванага слоў [5, 10]) **N. адуш. ж. → N. адуш. м., N. адуш. ж. → N. адуш. ж., N. адуш. н. → N. адуш. м., N. адуш. н. → N. адуш. ж., N адуш. м. → N адуш. ж.**

Група назваў асоб са значэннем 'адзінкавасці' ў беларускай мове перыяду 19 ст. налічвае чатырнаццаць намінацый і ўтвараецца ў межах пяці граматычных мадэлей: **N адуш. м. → N адуш.м., N адуш. Pl.t. → N адуш.м., N адуш. ж. → N адуш. ж., N адуш. Pl.t. → N адуш. ж., N адуш. аг. → N адуш. аг.** [6,7].


*Спіс літаратуры*

1. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. (6 кн.). – Мінск: БелСЭ,1977–1984.
2. Беларуска-рускі слоўнік: у 2 т. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа; рэд. К. К. Атраховіч (Кандрат Крапіва). – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск: БелСЭ, 1988 – Т. 1. – 813 с.; 1989. – Т. 2. – 748 с.
3. Сцяцко, П.У. Спрэчныя пытанні словаўтварэння: Асабовыя назоўнікі жаночага і мужчынскага роду як паралельныя ўтварэнні / П.У. Сцяцко // Роднае слова. – 1996. – № 9. – С. 89 – 94.
4. Бардовіч, А.М. Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы / А.М. Бардовіч, М.М. Круталевіч, А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларус. навука, 2000. – С. 402.
5. Лукашанец, А.А. Граматычны аспект славянскага словаўтварэння / А.А. Лукашанец. – Мінск: права і эканоміка, 1998. – С. 10.
6. Клундук, С.С. Словаўтваральная сістэма назоўнікаў са значэннем асобы ў беларускай мове XIX ст.: аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук: 10.02.01 / С.С. Клундук; НАН Беларусі. Ін-т мовазнаўства імя Я.Коласа. – Мінск, 2001. – С. 7.


## РОЛЯ НЕКАДЫФІКАВАНАЙ ЛЕКСІКІ Ў ЗАГАЛОЎКУ ПУБЛІЦЫСТЫЧНАГА ТЭКСТУ


*Ю.М. Бабіч*

*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Апошнія некалькі гадоў назіраецца імклівае пранікненне ў беларускі публіцыстычны дыскурс жарганізмаў, аргатызмаў, прастамоўяў, а таксама ўсё больш частае іх выкарыстанне ў назвах тэкстаў. Падобныя лексемы, вынесеныя ў загаловак, выступаюць своеасаблівым сэнсавым сігналам, адмысловым лінгвастылістычным актуалізатарам пэўнай праблемы.

Мэта: выявіць ролю некадыфікаваных лексем у загалоўку газетнага тэксту. **Метады і матэрыял даследавання**: У якасці асноўных выкарыстаны лінгвастылістычны і метад кампанентнага аналізу. Матэрыялам працы паслужылі тэксты з газет "Звязда" і "Наша ніва".



Рэпазіторый ВДУ